А.І.Самусенка, *дацэнт*

# ВУЧЭБНА-ТВОРЧЫЯ СІТУАЦЫІ ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ ПАЗНАВАЛЬНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ МУЗЫЧНЫХ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Глыбокія змены ў жыцці грамадства абумовілі з'яўленне новай парадыгмы ў адукацыі. Аднак праблема актывізацыі самастойнай пазнавальнай работы студэнтаў застаецца ў шэрагу "вечных" для вышэйшай школы. І гэта зразумела, бо веды, не стаўшыя аб'ектам асабістай дзейнасці, не могуць лічыцца сапраўдным здабыткам чалавека (А.В.Пятроўскі).

У распрацаванай канцэпцыі прафесійнай адукацыі ў галіне мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь (1999) зазначаецца пераход да прынцыпу развіцця асобы на аснове творчасці як метаду

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

навучання і выхавання. Існуе відавочная сувязь паміж творчасцю і самастойнай пазнавальнай работай маладога музыканта-выкладчыка, бо адно без другога немагчыма.

Разам з тым даследаванне, праведзенае намі на базе Беларускага інстытута праблем культуры і факультэта павышэння кваліфікацыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, сведчыць, што як выкладчыкі дзіцячых музычных школ, так і выкладчыкі музычных вучылішч адчуваюць цяжкасці менавіта ў тых відах дзейнасці, што патрабуюць творчага падыходу. Так, 35,0% выкладчыкаў дзіцячых музычных школ недастаткова валодаюць методыкай выканальніцкага аналізу музычнага твора; у 29,7% зафіксаваны дэфіцыт камунікатыўных уменняў; 26,6% не здольныя прагназіраваць развіццё асобы вучня, і столькі ж выкладчыкаў дрэнна ведаюць узроставыя асаблівасці сваіх навучэнцаў. Выкладчыкі музычных вучылішч адзначаюць цяжкасці ў фарміраванні рэпертуару вучняў, у рабоце як з безумоўна таленавітымі, так і з вельмі слабымі навучэнцамі, стварэнні асабістай праграмы самаўдасканалення. Па сутнасці гэта пытанні прафесіяналізму музыканта-выкладчыка.

Важкі ўклад ва ўдасканаленне падрыхтоўкі студэнтаў музычных ВНУ ўносяць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага цыкла. На думку шэрага даследчыкаў (А.А.Вярбіцкі, В.Л.Ляўдзіс, Н.Ю.Пасталюк і інш.), асноўнай характарыстыкай вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе з'яўляецца вучэбная сітуацыя, прадстаўленая сістэмай адносін паміж мэтамі, сродкамі і вынікамі навучання. Вучэбныя сітуацыі могуць разгортвацца на некалькіх узроўнях і вырашацца як індывідуальна, так і пры групавой форме арганізацыі работы.

З уласнай практыкі сведчым, што менавіта вучэбна-творчыя сітуацыі з'яўляюцца найбольш эфектыўным сродкам рэалізацыі мэт вышэйшай адукацыі музыканта-выкладчыка. Яны дазваляюць выяўляць супярэчнасці ў сістэме музычнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

адукацыі, усведамляць неабходнасць іх вырашэння і знаходзіць сродкі для гэтага; ствараць педагагічныя зносіны ў пастаянна зменлівых абставінах; будаваць вучэбны працэс як сумесную творчую дзейнасць; ажыццяўляць міжкурсавыя сувязі (педагогіка, псіхалогія, методыка, педагагічная практыка); фарміраваць у студэнтаў сістэмнасць прафесійных ведаў; паглыбляць цікавасць да прафесіі музыканта-выкладчыка; авалодваць метадамі самаадукацыі.

Прывядзём прыклады. Развіць матыў самастойнай пазнавальнай работы дапамагае аналіз педагагічнай дзейнасці выдатных музыкантаў мінулага, напрыклад братоў А. і Р.Рубінштэйн, Ф.Ліста, Ф.Шапэна, Ф.Блуменфельда, А.Гальденвейзера, Г.Нейгаўза, Ю.Янкелевіча і інш. У спісе літаратуры на выбар прадстаўлены каля 30 персаналій. Структурнай адзнакай аналізу з'яўляюцца кампаненты педагагічнага працэсу (мэта, змест, метады, сродкі, формы). Нестандартнасць сітуацыі заключаецца ў тым, што ў гатовым выглядзе звесткі ў прапанаванай літаратуры адсутнічаюць. Іх трэба здабыць у выніку самастойнага пошуку, роздуму, аналізу, трывалай апоры на тэарэтычныя веды з курса педагогікі. Затым на семінарскіх занятках кожны выступоўца знаёміць групу з вынікамі пошуку і атрыманымі высновамі. Каштоўнасны эмпірычны вопыт буйнейшых выкладчыкаў-майстроў дае падставу для роздуму, актуалізуе рэфлексію студэнтаў, дазваляе суаднесці тую ці іншую сітуацыю з асабістым вопытам, стымулюе самаадукацыю і самавыхаванне. Вынікам становіцца дыскусія на тэму "Які музыкант-педагог патрэбны сёння школе (дзіцячай, музычнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай)?"

Для часткі студэнтаў працягам самастойнага пошуку з'яўляецца напісанне дыпломнай работы, прысвечанай выяўленню педагагічных прынцыпаў выдатных музыкантаў, прафесараў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Так з'явіліся цікавыя даследчыя работы, прысвечаныя педагогіцы

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

народнага артыста Беларусі Я.П.Гладкова, заслужанага артыста Беларусі У.П.Перліна, заслужанага дзеяча мастацтваў М.Р.Солапава.

Вялікую цікавасць у студэнтаў выклікае прапанова вылучыць дыдактычныя прынцыпы стварэння "ідэальнага" вучэбнага дапаможніка для пачынаючага музыканта. Для гэтага група студэнтаў па жаданні падзяляецца на падгрупы па 3—4 чалавекі, якія самастойна знаёмяцца з выдадзенымі нарматыўнымі дакументамі і робяць параўнальны аналіз існуючых дапаможнікаў. Структурнай адзінкай аналізу становяцца дыдактычныя прынцыпы навучання. Абавязковай умовай для выкладчыка з'яўляецца ўключэнне ў спіс для аналізу як традыцыйных вучэбных дапаможнікаў, так і дапаможнікаў новага пакалення. Кожная падгрупа знаёміць сакурснікаў з вынікамі аналітычнай самастойнай працы.

Наступны крок — сумесны пошук абагульняючых прынцыпаў стварэння "ідэальнага" вучэбнага дапаможніка для пачынаючых музыкантаў. Новай ступенню ў самастойнай дзейнасці студэнтаў становіцца спроба рэалізаваць на практыцы здабытыя тэарэтычныя высновы і стварыць "аўтарскі" вучэбны дапаможнік для пачынаючых. Гэтая мэта натхняе будучых музыкантаў-выкладчыкаў, бо аналагі для такіх інструментаў, як домра, цымбалы, адсутнічаюць увогуле.

Падсумоўваючы сказанае, адзначым, што вучэбна-творчыя сітуацыі выконваюць актывізуючую, развіццёвую, інфармацыйную функцыі, забяспечваюць міжкурсавыя сувязі, асобасна-індывідуальнае навучанне студэнтаў. Далейшае ўдасканаленне гэтых сітуацый — надзённая задача сучаснай вышэйшай школы.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ